Манпасье, горнатэхнічны, малааўтарытэтны, камер-юнкер, кілават-гадзіна, сацыяльна-бытавы, нізінны, аўсяны, Случчына, машынны, таматны, удвая, за мяжой, злева, па-першае, з разгону, ні з чым, няўрымслівы, зусім не варты, не лепшы за яе, нябачны.

30. Спішыце словы (спалучэнні слоў), афармляючы згодна з правіламі беларускай арфаграфіі. Зрабіце арфаграфічны аналіз выдзеленых слоў.

Гл…тацць, усхода/знавец, Н…варасійск, м…розны, эд…львейс, ал…горыя, Складоўская/Кюры, ***н…ўцешна***, …гіпецкі, дз…сяцкі, фіта/біялогія, Цянь/Шань, паўночна/асецінскі, бела/польскі, бела/ружовы, раба/ўладальнік, дачка/ўцеха, на (Ў, У)шачы, 9 (М, м)ая, (К, к)упалаўскія радкі, (Б, б)аркалабаўскі летапіс, кал…е, піс…меннік, дз…ве, рэл…еф, ***камен…чык***, вэб/старонка, літаратура/знаўчы, ледзь/улоўны, глыбака/думны, глыбока/ўскапаны, ***(П, п)олаччына***, драўля(нн, н)ы, палымя(нн, н)ы, каме(нн, н)ы, цемя(нн, н)ы, без/разбору, на/двое, на/памяць, як/ніяк, у/пару, не/высокі, ні/ў/кога, не/прыяцель, далёка не/поўны, не/раней чым заўтра.

**Даведка**

2. Горад у гэтым месцы спускаўся з вялізнага груда, які вянчала гара Міндоўга, і ішоў у поле. Дзевяцьсот год горад мясціўся на грудзе, не адпускаў далёка вузкія пакручастыя вуліцы і вулкі, цесна груваціў адна пры адной хаты, як бы зграбаў іх сабе пад пахі, ашчаджаў кожным вольным лапікам зямлі, і толькі цэнтральная брукаваная плошча з двума касцёламі і шнурком крамаў ды парк пад Замкавай гарою яшчэ нагадвалі пра колішнія абсягі. Мусіць, некалі яны былі, гэтыя абсягі, аднак цяпер, калі глядзець з замчышча, бачыш адно чарапічныя дахі, дзе-нідзе з іх вытыркаюцца касцёльныя спічакі. Дзевяць стагоддзяў горад трымаўся груда – і раптам збег па адным з адхонаў у поле. А ў полі ўжо нішто не спыніць чалавека. Вуліцы пацягнуліся доўгія, роўныя, яны абрываліся пусткамі, на якіх ледзь угадваліся сцежкі ў густых лопухах і чартапалоху, – пасля зноў вуліцы. Тут жа адгарадзіўся ад хат цаглянай сцяною і завод газавай апаратуры, утыркнуўся ў неба доўгімі трубамі, задыміў. Горад цяпер як бы раздзяліўся. У адным, верхнім, былі крамы, школы, кіно, руіны замка і базар, у другім, ніжнім, – завод, абсаджаны хатамі, пусткі, сажалкі, закінуты сад пры бальніцы, палявыя дарогі, якія знікалі ў лагчынах між спадзістых узгоркаў. Палі тут ляжалі на ўзгорках, уся гэтая зямля была падвышаная, а пасярэдзіне – груд з горадам.

Мацкевічы жылі ў ніжнім горадзе, у чатырохкватэрным драўляным доме для выкладчыкаў тэхнікума. На адной з пустак, насупраць гразкай сажалкі, якую што год налівалі веснавыя і восеньскія дажджы, паставілі адзін дом, побач заклалі другі. Адразу за домам пачынаўся поплаў, за якім разлягаўся бальнічны сад. Але сад ніхто не даглядаў, ён быў прахадны, таму і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яблыкі ў ім нясмачныя, імі грэбавалі нават тутэйшыя хлопцы. Пад садам вялікая сажалка з дзвюма крыніцамі.

Алесь Кажадуб. “Цюльпаны”.

4. Сасоначка расла не ў гушчары, як большасць, а між стромкіх, ладных ужо сясцёр. І сонца ёй было тут удосталь, і дажджавой вадзіцы хапала, ды ніхто знячэўку і стаптаць не мог. Расла сасоначку ў зацішку, цягнулася да неба, туды, дзе начамі пломмай высяваліся зоркі, дзе месячык пастухом-бацькам праходзіў між імі. Часам здавалася сасоначцы, што дагоніць яна старэйшыя дрэвы, перарасце і выпрастае вершаліну над усім лесам. Тады ўжо ніводная птушка не міне яе вершаліны, каб на хвілінку не прысесці, склаўшы крылы, не паглядзець у бясконцасць ды парадавацца жыццю. Якое ж яно, жыццё, неахопнае, шырокае і бяскрайняе, радаснае і шчаслівае. А магутныя вятры-буравломы ды злыя спякоты – часовае. Усё гэта мінае, і зноў застаюцца шаравата-блакітныя ліпеньскія вечары, майскія спевы птушак, куванне самой зязюлі, вэлюм празрытага туману, які прыходзіць з грыбнымі дажджамі з далёкіх і блізкіх лугавін, з ручаёў, крынічных рачулак, аерных балацявін. Жыццё прыгожае і доўгае, яго ніхто-ніхто не можа адняць. І дрэўца жыло кожным днём напоўніцу, узахлёб, не ашчаджаючы сілаў і дабрыні, радуючыся кожнай хвілінцы, кожнаму гуку ў наваколлі. Яна пакуль не ведала, што побач жывуць нястомныя жукі-караеды, што зусім недалёка селішчы людзей, у якіх ёсць сякеры і пілы, што ім трэба будаваць хаты, разводзіць агонь у печах. Але яна, сасоначка, нікога не чапае, жыве тым, што даецца кожнаму бясплатна, спакон веку. Дык навошта ж быць самотнай? Навошта па начах уздыхаць, рыпець засохлымі галінамі, пабітымі маланкай расшчэлінамі. Трэба ж кожную раніцу чакаць, калі ўзыдзе сонца, якім яно будзе – празрыста-яркім, сляпучым ці слюдзяніста-бляклым, заплаканым. Расла сасоначка, заглыбляла карэнне ў зямлю, зіхацела сярод буравcovered ствалоў залацістасцю здаровай кары… Жыла, расла сасоначка.

Частыя буралломы абміналі закутак гэтага лесу, а калі і налятаю, на зямлю з надрыўным уздыхам лажыліся магутныя, выспелыя дрэвы. А сасоначка расла, расла і радавалася.

Анатоль Казлоў. “Незламаная свечка”.

6. Стаяла ранняя, зусім яшчэ нясмелая восень. Было цёпла, сонечна і парна. На сінім купале высокага неба толькі зрэдку з’яўляліся шызыя хмары. Спакваля і няспешна ўсталёўвалася пара тыповай для беларускіх абшараў і звыклай для нас стрыманай красы прыроды.

Славуты нарачанскі край, радзіма аднаго з найярчэйшых талентаў беларускай літаратуры… Усё тут было тыповае для Беларусі, для яе клімату, прыроды і ландшафту, але нібыта вызначалася больш напоўненым зместам, адмысловай эстэтычнай выпраўкай. Калі свяціла сонца, то свяціла абавязкова шчодра, на фоне не інакш як чыстага бакітнага неба. У яго пяшчотным, часам пякоткім промневым палоне, здавалася, цешылася ўсё жывое і нежывое. Калі ўсчынаўся вецер, то быў ён напорлівы, парыўчаты, уздымаў такія хвалі, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на вачах ператваралі возера ў мора – наша беларускае мора. Яны настырна біліся ў борт лодкі, нахілялі яе то адным, то другім бокам, пагрозна захліставаючы ўспененай вадою.

Сонечная шчодрасць і лагода, мяккая цеплыня і лёгкая хмарнасць час да часу змяняліся казытліва-волкай прахалодай дажджу, у вясёлых і спорных струменях якога на нейкі момант патанала ўсё наваколле. Яго буйныя кроплі падалі на ствалы і галіны дрэў, рудую іглiцу і яшчэ зялёны мох. Здавалася, што тут, побач з возерам, усё, у тым ліку і зямля, і паветра, і неба, пахне вадою.

Дождж ленавата аціхаў і адступаўся. Даўгавата яшчэ пасля яго ў пажоўклае лісце, што ўкрывала лясны дол, шпокалі кроплі. У вільготным паветры стаяў водар ядлоўцу і моху. Спакваля сонечныя скразнякі зноўку пачыналі працінаць шаты разгалістых дрэў, нават калючыя лапы ельніку. Лашчылі вока і лагодзілі душу сіняя паднебная высь і празрыстая азёрная далеч. Усё навокал нібыта ажывала, іскрылася, ружавела, маладзела. Свежасць і хараство, здавалася, былі разлітыя паўсюль.

Так, гэта была незвычайная зямля, незвычайныя ваколіцы. Усё было высокае, крамянае, яркае – сапраўднае, жыццядайнае. Адна і тая ж думка ніяк не адпускала мяне, настойліва нагадвала пра сябе зноў і зноў: толькі такая прыгожая зямля магла нарадзіць такога слыннага чалавека, як Максім Танк. (291 слова)

Мікола Мікуліч. "Шумяць нарачанскія сосны".

8. Быў асенні надвячорак, адзін з тых нячастых, якія здараюцца такой парою, калі вялікае бляклa-чырвонае сонца на шыза-зеленаватым небе нагадвае жывы шар. Гэты шар, здавалася, вось-вось набрыняе цяжкай ружовістасцю і тады не ўтрымаецца на нябесным полазе, сарвецца каля далягляду, упадзе на вострыя вяршаліны цёмна-блакітнага лесу, праколецца і зальe ўсё навокал густой вязкай бронзай.

У такі надвячорак усё быццам падказвае – блізіцца пара па-сапраўднаму халодных начэй: і гэтае сонца, што нязвыкла хутка коціцца да далягляду, пакідаючы на крохкім небе бела-ружовыя драпіны, і сшэрхлая жоўтая трава, якую ўжо апоўдні акрапляе дробная халодная іскрыстая раса, і пажухлыя, яшчэ не аголеныя кроны дрэў, і парывісты сіверны вецер, што час ад часу ўзнімае на рачной плыні дрогкае рабацінне.

Усё гэта бачыў і разумеў Чалавек, які доўга і нерухома стаяў з вудай на беразе ракі. Часам ён рэзка вышморгваў з вады кручок і, нават не глянуўшы на яго, ці засталося там што, кароткім спрактыкаваным узмахам ад сябе кідаў назад, хоць ведаў, наўрад ці і зараз тузанецца паплавок, нырне пад ваду.

Часам ён нібы безуважна назіраў на крохкую, ледзь прытуманеную лугавую далячынь. Яна адкрывалася адразу за ракой і здавалася заціснутай з аднаго боку вострым кутам сасновага лесу, абгароджанага высокім шчыльным зялёным плотам, а з другога – пагоркам, парослым куртатымі жоўта-зялёнымі дрэвамі, за якімі адзінока паблісквала бляшаная страха нейкага прыватнага дачнага доміка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Калі вочы стамляліся ад аднаго малюнка, Чалавек пераводзіў позірк на раку, якая ля пагорка крута паварочвае, выгінаецца паўз яго, бяжыць краем лугу. Тады яму здавалася, што гэтая халодная па колеры, звілістая шырокая стужка, па якой вечаровае сонца шчодра рассыпала залацістыя бліскаўкі, рассоўвае сасновы лес і пагорак, нібы вызначае кожнаму з іх сваё месца на зямлі.

І яшчэ думалася: напэўна, людзі не ведаюць, што ўсяму на свеце: кожнаму дрэўцу і пагорку, кожнай лугавіне і кожнай жывой істоце, вядома ж, і чалавеку – яшчэ да нараджэння Усявышнім вызначана сваё месца. (298 слоў)

Уладзімір Саламаха. “Апазнаецца асоба мужчыны…”

10. Напэўна, адна з самых балючых страт для чалавека – страта малой радзімы, кроўнай сувязі з ёю, страта сваіх каранёў, той жывільнай энергіі і чысціні, якімі поўняць нас родная зямля і самыя блізкія людзі. Таму хочацца яшчэ і яшчэ раз азорыцца святлом маленства, пакланіцца чароўнай вёсачцы, мілым, дзівосным краявідам і наталіць душу іх хараством.

Залаты куток майго дзяцінства, блакітныя арэлі маіх мар, надзей і памкненняў – невялічкая вёска Заброддзе, што на Быхаўшчыне. Тыя мясціны, дзе ўсё напаўняла душу разнастайнымі фарбамі і адценнямі, гукамі і павевамі, ахінала мудрасцю і красой, трывогамі і перажываннямі. Тыя сцяжынкі і дарожкі, якія тысячы разоў вымерваў басанож, па якіх пайшоў затым у няпростае, але вельмі цікавае самастойнае жыццё. Тыя звычайныя, цягавітыя, цярплівыя і добрыя людзі-аднавяскоўцы, і найперш – мае бацькі, ад якіх я ўзяў з сабой у дарогу шчырасць, апантанасць, сілу волі, прагу ведаў, трываласць духу, веру ў дабро і справядлівасць, настойлівасць у працы, павагу да руплівых людзей, любоў да Бацькаўшчыны…

Маё дарагое Заброддзе налічвала тады 33 двары, хаты і пабудовы патаналі ў густой зеляніне садоў і алей. Збоку ад бойкай дарогі на Быхаў вёска нагадвала дзівосны аазіс на ўзгорку, зачароўваючы кожнага, хто трапляў у яе, сапраўдным зялёным раем. Вясной у палісадах тут разлівалася чаромха, струменіўся шматколернымі фантанамі бэз, а сады, здавалася, аж да самага неба дыхалі густым духмяністым водарам, здзіўлялі наваколле ўрачыстай белізной. Улетку пад вокнамі стракатліва і ўзнёсла палымнелі кветкі: вяргіні, півоні, рамонкі, наготкі… Звінела, нібы цурчэла, саладжавае паветра, гулі пчолы, нацягваючы тысячы зумкіх струн ад вулляў да мядовых ліп і назад. А вакол вёскі каласілася жыта, сінеў і гайдаўся, нібы марскія хвалі, лён, лапушылася бульба, цвіла грэчка… А далей – клікалі сваімі непаўторнымі кілімамі шаўкавістыя лугі і вабіла гаючай вадой рэчка Грэза… І ў гэтым багатым разліве акварэляў і музыкі свет часта ўяўляўся мне бясконцай, дзівоснай казкай, хваляваў, радаваў, абуджаў уражлівую дзіцячую душу, назаўсёды высяваючы ў ёй спагаду і замілаванасць.

Міхась Пазнякоў. “І роднай вёсцы пакланюся”.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

12. Вячэрні змрок хутка наступаў на Заблудную лукавіну. Некалькі хвілін таму на вершаліны векавых дубоў яшчэ іскрыліся жаўтаватым жнівеньскім лісцем у сонечных промнях, і вось цені-шчупальцы ад галінак цягнуцца да зямлі. Кусты, што запаланілі гэты ўскраек зямлі, пачалі проста на вачах распаўзацца, расплывацца, ператвараючыся ў зменлівыя хісткія прывіды. З бакоў Заблудную лукавіну ўзяла ў клешчы рака Мнюта. Яе чыстая празрыстая вада адгарадзіла невялікі лапік зямлі як не ад усяго свету, пакінуўшы толькі вузкі праход у адным месцы.

Пасярод векавых дубоў ураслі ў зямлю два вялікія камяні-валуны. Адзін, што крыху меншы, быў над самым берагам ракі і, падточаны знізу паводкамі, кожную вясну мог зваліцца ў раку. Другі, большы, падобны на калматага агромністага мядзведзя, які толькі ўзняў морду, каб агледзець наваколле пасля зімовай спячкі, ды, бы зачараваны, так і застыў на стагоддзі. Камень-мядзведзь зялёны, з нейкім бурштынавым адлівам. Праўда, адзін бок чорны, але не ад прыроды, а ад дыму вогнішчаў, што кожны вечар палілі тут сябры – Віцька, Цімка і Пятрусь. Заблудная лукавіна, гэтыя валуны, векавыя дубы, рака – усё было іх месцам, іх маленькім патаемным куточкам, дзе можна рабіць, усё, што хочацца… Сюды ніколі не хадзілі дарослыя, лічылі Заблудную лукавіну месцам нядобрым, нават небяспечным.

З надыходам вечара, як толькі знікала над Замкавай гарой сонца, Заблудная лукавіна ажывала. З боку невялікага балота, куды сябры ніколі блізка не падыходзілі, калі-нікалі даносіліся глухія гукі, бы ***хтосьці*** цяжка ўздыхаў і клікаў на дапамогу. У гэтыя моманты сябры бліжэй падсоўваліся да цяпельца, гаварылі толькі шэптам. Часам здавалася, што разам са стогнам сіліўся ўзняцца на лапы і камень-мядзведзь, але нешта вельмі моцна трымала яго, не адпускала. Сябры ведалі, што гэта стогне багна. Раней сябры ніколі не заставаліся да ночы на лукавіне, баяліся. Але ж паляцелі ў космас Гагарын, Цітоў, а яны баяцца ноччу быць у Заблудцы… Пад вялікім сакрэтам вырашылі рыхтавацца таксама да палётаў у космас і перш-наперш набрацца смеласці, пазбавіцца ад розных страхаў. Вырашана – зроблена. (304 словы)

Віктар Праўдзін. “Хто наступны?”

14. Паводле Георга Зімеля, нямецкага філосафа, у свеце зрокавых вобразаў не існуе нічога, што падобна да твару чалавека. Вочы і пагляд маюць вялікае значэнне, асабліва ў жывапісе. Вочы перадаюць адухоўленасць асобы. Гэта сапраўды “вокны душы”. Праз вочы перадаецца псіхалагічны стан чалавека, у іх адбіваецца кожная падзея, перажыванні, унутраны стан чалавека. Імпульс вачэй, пагляду даносіць да нас магутную сілу духу.

Вочы бываюць розныя. Далікатная, вытанчаная прыгажосць міндалепадобных вачэй патрабуе ў малюнку дакладнасці ліній, плаўнасці і мяккасці формы. Інакш трэба маляваць выпуклыя вочы, зусім па-іншаму – вочы, якія глыбока пасаджаны ці “праваліліся”, а яшчэ ж ёсць круглыя вочы… І нават квадратныя! Вядома, апошнія – умоўнасць, ужытая мастаком, каб у грубай форме перадаць пэўныя характарыстыкі асобы. Вочы ў

праменьчыках маршчынак або ў атачэнні глыбокіх маршчын-разорак, або з мяшкамі, прыпухлымі павекамі. Вочы з вузкім разрэзам, як бы прыплюснутыя на твары, і г.д. Кожны народ мае свае этнічныя адметнасці тыпу вачэй – разрэз, форма, колер, прапарцыянальныя суадносіны з астатнімі часткамі твару.

Вочы мастаку пазнаваць усё сваё жыццё. Вочы чалавека, засяроджанага ў сабе, вочы пустыя, напружаныя. Вочы шчаслівыя, пахмурныя, трагічныя, насмешлівыя, жорсткія, какетлівыя. Вочы закаханыя, гнеўныя, заклапочаныя, хітрыя, разумныя або бязглуздыя, лагодныя або калючыя, спагадныя або асуджальныя. Вочы жывыя або мёртвыя… Пералік характарыстык вачэй, пагляду – бясконцы.

Асобнай увагі патрабуюць вочы дзіцяці, у іх форме, тым, як пасаджаны на твары, іншых адметнасцях закладзены ўжо ад прыроды важныя індывідуальныя характарыстыкі будучай асобы.

Вочы жанчын – асаблівыя, непаўторна прыгожыя і какетлівыя. Зачароўваюць сілай імпульсу жаноцкасці, самой сутнасці жанчыны. Ва ўсіх праявах раскрываюць глыбокі прыродны дар, загадкавасць і невыказнасць пачуццяў. Унікальная па сваёй сіле жаноцкасці, ідэалізацыі "Джаконда" Леанарда да Вінчы, створаная прыкладна ў 1510-1515 гадах. Вочы "Джаконды" – насмешлівыя і высакамерныя, у іх прыцягальная сіла і разбуральная недаступнасць. (297 слоў)

Віктар Альшэўскі. "Пачуццё раўнавагі, альбо час узыходзячага сонца".

16. Спеўныя смалістыя бары з зязюльчыным кукаваннем і дзятлавай марзянкай; заваложаныя смугой цяністыя гаі з чырвоным россыпам суніц на пагорках і ружовымі лапікамі чабору ўздоўж дарог; невялічкая віхлястая рачулка Пціч, што ціха струменіцца ў прыбярэжных вольхах і вербалозах. Прыгожыя і маляўнічыя мясціны, дзе ў вёсцы Закружка, паблізу ад Мінска, нарадзіўся і вырас Уладзімір Карызна.

Там, у дзяцінстве, ён, вядома, не мог угадаць свой жыццёвы лёс – проста блукаў у гаях і дубровах, купаўся ў лугавых травах і красках, пакуль уражлівая, чулая душа не адгукнулася на гэты вечны покліч прыроды. Нарадзіліся вершы, ухвальна ацэненыя знаўцамі паэзіі яшчэ тады, напрыканцы пяцідзясятых гадоў. У маладога паэта выразна акрэслілася свая, уласная тэма: хараство роднай зямлі, яе боль і пакуты, жаданне дарыць радасць і дабрыню. Пра непарыўную сувязь з Бацькаўшчынай сведчаць нават самі назвы яго паэтычных кніг – "Край мой сінявокі", "Жураўліны досвітак", "Святло ліўня", "Цеплыня", "Цішыня баразны".

Былі ўжо надрукаваны першыя вершы, і сябры віншавалі маладога аўтара з відавочным поспехам, калі нечакана паэт заўважыў дзіўную рэч: усё уладней яго існасць забіраюць у незваротны палон музыка, беларускія народныя песні. Варта аднойчы было ўбачыць майскі надвячорак з квітнеючымі садамі і глыбокім чыстым небам над галавой, як душа, раптам набыўшы крылы, перапоўнілася чароўнымі гукамі вясны. Магчыма, прычынай таму сталі даўнія матчыны калыханкі, напевы бацькавай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

балалайкі, вясёлыя і журлівыя песні аднавяскоўцаў. Але, вярнуўшыся ў свой студэнцкі інтэрнат, малады паэт сеў за стол, і здарыўся цуд: усе гэтыя таямнічыя "до-рэ-мі-фа-соліны", таленавіта рассыпаныя па нотным аркушы, утварылі глыбока лірычную, распеўную мелодыю. Вы, напэўна, здагадаліся, што гаворка ідзе пра вядомую песню Уладзіміра Карызны "Беларусь мая сінявокая". Так, гэта яна – прыгожая, дужа гарманічная, любімая ў народзе, ды, апроч таго, прыдатная і для хору, і для асобнага спевака – якасць увогуле характэрная для кожнай цудоўнай песні. "Беларусь мая сінявокая" надзвычай чароўна гучыць у выкананні жаночага хору – сапраўды заслухаешся. (292 словы)

Віктар Гардзей. "Цёплая, нібы вясны світанне…"

18. Лямпачка цьмяна гарэла недзе ўгары, на чацвёртым ці пятым паверсе, і таму на лесвіцы стаяў прыцемак. Марына павольна пераступала з прыступкі на прыступку, падымаючыся ўсё вышэй і вышэй, і, калі б хто паглядзеў на яе ў гэтую хвіліну, напэўна сказаў бы, што дзяўчына да нечага прыслухоўваецца. Але ў калідоры панавала ціша, сюды ў позні час не далятаў ніводзін гук ні з вуліцы, ні з кватэр вялікага шматпавярховага дома, толькі высокія абцасы Марыніных чаравікоў стукалі па бетоне лесвіцы.

Дзяўчына ўзышла на першую пляцоўку і, глыбока ўздыхнуўшы, прыпынілася, высокая зграбная постаць яе нібы замерла. І зноў можна было падумаць, што дзяўчына імкнецца штосьці пачуць у гэтай густой цішы, імкнецца – і не можа, бо адзінае, што чуваць зараз, -- гэта стук уласнага сэрца.

Вядома, шмат па якіх прычынах можа стукаць дзявочае сэрца, асабліва калі ёй толькі дваццаць год. Хоць бы і па той, што ўвесь вечар давялося танцаваць з маладым сімпатычным хлопцам, у якога такое харошае, гучнае імя – Антон.

"Хто ж ён такі, гэты Антон?" – думала Марына, узіраючыся ў акно, якое цяпер было чорнае-чорнае. Там, у акне, нібы ў люстэрку, відзён быў яе твар. Марына бачыла свой высокі адкрыты лоб, крыху задзірысты нос, дзве ямачкі на шчоках, але ўяўленне малявала іншы твар – ягоны, Антонаў. І ёй пачынала здавацца, што з аконнай шыбы на яе пазіраюць і нават трошачкі ўсміхаюцца цёмныя Антонавы вочы, тыя самыя, што ўвесь вечар сачылі за ёю з-пад броваў, якія амаль сышліся ля пераносся.

Малады чалавек вылучаўся сярод усіх, хто быў у гэты вечар на танцах: на ім быў добра пашыты светла-карычневы гарнітур, у той час як большасць з тых, каго ведала яна, насілі чорныя кіцелі або гімнасцёркі – звычайную форму чыгуначнікаў. Танцаваў малады чалавек вельмі хораша, Марыне было прыемна з ім, і таму, калі ён запрасіў яе на новы танец, яна без вагання дала згоду. (294 словы)

Яўген Васілёнак. "Гаспадыня".

20. На календары яшчэ амаль тыдзень да восені, але сонца, заходзячы ў чырвані, вяртаецца на зямлю белым, белымі іскрамі прыпадаюць ужо ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нізінах да траў прымаразкі. Падобна да таго, што само сонца б'ецца спякотнымі промнямі аб скамянелую зямлю, высякае гэтыя іскры, белы халодны жар. Па-іншаму ніяк і не растлумачыць таго, што адбываецца: удзень паліць – спасу няма, а ўначы выстуджвае. І месяц над вёскай увесь час у венчыку, у касыначцы – на добрае надвор'е, на спёку і холад.

Раней за адведзены ім час, ці то на бясхлебіцу, ці то прадчуваючы халады, збіраюцца ў цёплыя краіны буслы, як не сотні збілася іх на сенажаці, каб пагаманіць апошні раз на роднай зямлі. Што ні кажы, калгасны сход, гэткае наўгародскае веча, нібыта з вякоў векавечных паўсталі з зямлі дзяды і прадзеды – сівыя, босыя. Няспешна, спаважна ўглядаюцца ў высокае чыстае неба, махаючы яму крыламі: пачакай, маўляў, неба, паспеецца, пакуль што абмяркуем зямное.

Толькі на самоце, калі на душы бусла спакойна і ціха, калі, распластаўшы ружовыя на сонцы крылы, выблісктваючы кожным пяром, падрульвае ён задубелымі доўгімі нагамі да сваёй буслянкі, вітальнай песняй адзначае сваё вяртанне з далёкіх краін. Калі на дасвецці выйдзе ён на родныя гоні – палі, дубровы, сенажаці – і кіне яго ў жар і холад ад няўпыннасці і бясконцасці жыцця і зямлі, тады, не памятаючы сябе, адкінуўшы сціпласць і сарамяжлівасць, безгалосы, зацягне ён сваю, хоць і не зусім удалую, але радасную, шчырую песню нараджэння новага дня. А дзень бусла, як і сялянскі, спрэс у працы. Нібыта каморнік, мерае ён балота, падоўгу ўглядаецца сумным вокам у нікуды, ці то імкнецца зазірнуць, што там, за далягядам, ці то засяродзіць свой позірк у сабе, слухае шапаценне мяцёлчатых і вастралістых траў, як здатны слухаць гэтыя травы сівы дзед-паляшук. (277 слоў)

Віктар Казько. "Неруш".

22. Па сабе ведаю, што нейкія цэлыя падзеі, карціны-вобразы выклікаюцца, скажам, павевам у паветры свежавымытай бялізны, развешанай марозным сонечным днём на вяроўках сушыцца. Якія асацыяцыі будзіць адзін гэты пах? У мяне чамусьці – вострую свежасць агурочнага цвету і завязь першых агуркоў на градах, пазней далучалася адчуванне свежасці толькі што разрэзанага свежага кавуна.

А тонкі, невыказна ўражлівы цнатлівасцю сваёй расіста-жамчужнай чысціні пах ландыша! Цяпер, на старасці год, пачуць яго – гэта падзея, роўная для мяне далучэнню да вялікага душэўнага прасвятлення, як пачуць, скажам, раптоўны сярэбраны россып салаўінага рэха.

Пах і слых будзяць, жывяць і замацоўваюць у памяці падзеі і вобразы, якія па сваёй духоўнай сутнасці вельмі нечым дарагія для кожнага з нас. Многія дзясяткі год не магу забыць і ніколі не забудуся, як пасля вайны, прыехаўшы ў свае Еўлічы, адвячоркам на захадзе сонца я ішоў наведаць магілу бацькі. Свой настрой і думкі ў тую хвіліну я запомніў, мабыць, таму, што ўрэзаўся мне ў памяць пах цёплай раллі. Цішыня і некалькі нястройных жаночых галасоў, якія няўпэўнена спрабавалі падняць над полем песню, не столькі зрокавыя і слыхавыя прыкметы роднага мне краявіду, але, відаць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эмацыянальныя асацыяцыі. Яны замацавалі ў памяці і мой настрой, і развагі, што былі асабліва дарагімі і важнымі для мяне ў тыя хвіліны. Пра што я думаў, да якіх пачуццяў далучаўся душою – пра гэта пазней былі напісаны вершы “Край гасцінца” і “Ядлоўцавы куст”.

Першыя замаразкі мне заўсёды пахнуць чыстай, свежавымытай палатнянай тканінай – настольнікамі, ручнікамі, прасцінамі.

Памятаю, як зласловілі калісьці крытыкі і парадысты над Кузьмой Чорным, праз усю творчасць якога праходзіць вострае адчуванне паху зямлі, асабліва ў ранніх яго апавяданнях і раманах. Колькі там пахаў – усюды і скрозь! Для даследчыка, глыбокага псіхолага гэты наш пісьменнік у многіх сваіх гранях – скарб у аспекце спазнання псіхалогіі творчасці і сігнальнай сістэмы мыслення і памяці. (286 слоў)

Васіль Вітка. “Вузельчык на памяць”.

24. Добрае пачуццё поўніла Аленку, калі яна, развітаўшыся з маці, пайшла з цэха. І было шкада, што трэба ісці, і яна сказала сабе, што прыйдзе сюды зноў, што, магчыма, увогуле будзе калі-небудзь тут працаваць.

Аленка выйшла на ганак і з вышыні яго ўбачыла горад, заліты вечаровымі агнямі, чорна-бліскучыя шаты таполяў усцяж тратуараў і за імі незвычайна лёгкую, бы не важкую зусім, ажурную арку моста. Над галавой белым глобусам вісеў плафон, і ў святле яго Аленка нечакана заўважыла, што рукавы кофтачкі зырка і пералівіста зіхацяць ад мноства танюткіх маленькіх зорачак, падобных на сняжынкі. Аленка паспрабавала ўзяць адну з іх, дакранулася, але пальцы нават не адчулі дотыку шкла.

Аленка ішла па вуліцы, і на вуліцы таксама гарэлі электрычныя ліхтары, і ад іх святла, толькі цяпер больш цьмяна, зіхацелі шкляныя ніці-павуцінкі на рукавах кофтачкі. І хоць ніхто не звяртаў на Аленку ўвагі, ёй, аднак, здавалася, быццам усе ведаюць, што яна працавала сёння на заводзе, бо бачаць зіхатлівае павуцінне на яе адзенні.

На мосце Аленка прыпынілася, зірнула на ваду, у якой адбіваліся ярка асветленыя заводскія карпусы, падобныя на дзівосны карабель, і адчувала сябе часцінкаю таго вялікага і цікавага жыцця, што ішло за асветленымі вокнамі завода.

Аленка раптам адчула: яна пачынае разумець маці так, як не разумела ніколі дагэтуль. Быццам з вышыні, але дужа ясна і выразна ўбачыла розныя дробязныя нязгоды, што часам былі ў яе з маці, адчула нікчэмнасць тых сваіх патрабаванняў, адчула сваю вінаватасць. І тут жа ўявіла сабе школу, будучы вечар, на якім давядзецца выступаць, і падумала пра тое, што ёй цяпер ёсць пра што расказаць, што яна будзе расказваць доўга і гэтае яе апавяданне будзе самае цікавае, бо наўрад ці ёсць дзе праца цікавейшая, чым тая, якую робіць яе маці. (278 слоў)

Алесь Савіцкі. “Шкляная нітка”.

26. Груша-дзічка – мой пропуск у дзяцінства. Як забаронны знак, як перасцярога, як стоп-сігнал спачатку выплывае гэты малюнак, і толькі потым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

расчыняецца брама ў далейшыя ўспаміны, найперш усё-такі звязаныя з гэтым дрэвам пасярод поля.

Як бы ні мільгацелі за акном краявіды, перад маімі вачыма быў адзін, той: зялёная груша-дзічка пасярод жоўтага поля. Па некалькі метраў вакол дзічкі трактарысты не заворвалі, пакідалі лапік зямлі, які заўсёды ярка зелянеў густою, упартаю травой. Колькі б мы ні тапталі яе, як бы ні мінялі, яна ўставала, адыходзіла за ноч і да самай зімы заставалася нязменнаю. Здавалася нават, што і пад снегам не адмірала яна зусім, бо з ранняй вясны была тут высокаю і зялёнаю, як нідзе.

Дзічка была ў камлі тоўстаю – мы ледзь-ледзь абдымалі яе, узяўшыся за рукі, і ад самай зямлі пачыналася ў ёй і цягнулася метраў на два дупло. Некалі нехта расклаў пад ігрушаю вогнішча і пакінуў яго – мо хто з трактарыстаў, якім абрыдла абворваць дрэва, а мо хтосьці проста забыўся патушыць агонь. Але груша не здалася, здужала і жыла з дуплом. Вось у гэтае дупло і любілі мы хавацца, калі гулялі ў хованкі. Усе пра яго ведалі і, нягледзячы на тое, што шукаць ішлі  найперш сюды, кожны раз некалькі хлопцаў кідалася да дупла. Унутры дупло было чорным, аднак сажа ўжо не бралася, бо вышмальцавалася-выслізгалася да бляску. Дупло было скразное, навылёт, а значыць, мела два ўваходы-выхады, і ў таго, хто хаваўся ў ім, заўсёды быў шанц выскачыць непазнаным і перагнаць таго, хто шукае.

Праязджаючы паўз сваю вёску, якая хавалася за лесапаласою, я хацеў угледзець з акна вагона дзічку, узіраўся пільна, аднак не ўбачыў з-за дрэваў нават ніводнае хаты. Захваляваўся, але адразу ж супакоіў сябе: сцяжына ў бок вёскі пратаптана. Значыць, вёска жыве, а раз жыве вёска, то павінна жыць і дзічка. (287 слоў)

Барыс Пятровіч. “Успамін. Дзічка”.

28. Навадзвінск, узгор’е, латарэйны, жэтон, чарапіца, сямейны, трыдзясяты, бяссэнсіца, ясянёвы, маламетражны, Паўднёва-Афрыканскі рэгіён, маральна ўстойлівы чалавек, Ханты-Мансійск, прэс-рэклама, свежаскошаны, ва ўніверсітэце, аўкцыяніст, князь усемагутны, бацька-ўзбек, радыус, Алеуцкія астравы, мележаўскі стыль, Купалаўскія чытанні, 8 Сакавіка, Сімяон Полацкі, Афанасьеў, Лавуазье, альянс, п’еса, агеньчык, ваенна-марскі, ваеннаабарончы, астрашыцкагарадоцкі, чалавека-год, обер-кандуктар, Ушаччына, птушыны, вінны, задуменны, зубрыны, наўскід, увечары, як след, дзе-нідзе, па-воўчы, няпраўда, ні з кім, ніколькі не горшы, не горшы за брата, аніхто.

30. Глытаць, усходазнавец, Новарасійск, марозны, эдэльвейс, алегорыя, Складоўская-Кюры, няўцешна, егіпецкі, дзясяцкі, фітабіялогія, Цянь-Шань, паўночнаасецінскі, белапольскі, бела-ружовы, рабаўладальнік, дачка-ўцеха, на Ушачы, 9 Мая, купалаўскія радкі, Баркалабаўскі летапіс, кальє, пісьменнік, дзве, рэльеф, каменьчык, вэб-старонка, літаратуразнаўчы, ледзь улоўны, глыбакадумны, глыбока ўскапаны, Полаччына, драўляны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палымяны, каменны, цемянны, без разбору, надвое, на памяць, як-ніяк, у пару, невысокі, ні ў кога, непрыяцель, далёка не поўны, не раней чым заўтра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ